| | |
|---|---|
| Прэзідыум Слонімскага раённага Савета дэпутатаў | Президиум Слонимского районного Совета депутатов |
| Слонімскі раённы выканаўчы камітэт | Слонимский районный исполнительный комитет |
| РАШЭННЕ | РЕШЕНИЕ |

16 лютага 2021 г. № 128/181

Аб выніках раённага спаборніцтва за дасягненне высокіх паказчыкаў у працы і сацыяльна-культурным развіцці ў 2020 годзе

На падставе Інструкцыі аб арганізацыі і падвядзенні вынікаў раённага спаборніцтва сярод суб’ектаў гаспадарання, калектываў вытворчых падраздзяленняў, установ сацыяльнай сферы, сельсаветаў, працаўнікоў раёна за дасягненне высокіх паказчыкаў у працы і сацыяльна-культурным развіцці ў 2020 годзе, зацверджанай рашэннем прэзідыума Слонімскага раённага Савета дэпутатаў і Слонімскага раённага выканаўчага камітэта ад 19 мая 2020 г. № 139-520, матэрыялаў, прадстаўленых рабочай групай, утворанай распараджэннем старшыні Слонімскага раённага выканаўчага камітэта ад 19 студзеня 2021 г. № 6р, прэзідыум Слонімскага раённага Савета дэпутатаў, Слонімскі раённы выканаўчы камітэт РАШЫЛІ:

1. Прызнаць пераможцамі раённага спаборніцтва за дасягненне высокіх паказчыкаў у працы і сацыяльна-культурным развіцці ў 2020 годзе сярод:

1.1. працоўных калектываў прадпрыемстваў прамысловасці:

працоўны калектыў адкрытага акцыянернага таварыства “Слонімскі мясакамбінат”;

працоўны калектыў Гродзенскага абласнога ўнітарнага паліграфічнага прадпрыемства “Слонімская друкарня”;

1.2. працоўных калектываў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў і лесагаспадарчых устаноў – працоўны калектыў Слонімскага раённага ўнітарнага сельскагаспадарчага прадпрыемства “Пераможац”;

1.3. працоўных калектываў будаўнічага комплексу, меліярацыйных сістэм і жыллёва-камунальнай гаспадаркі – працоўны калектыў адкрытага акцыянернага таварыства “Слонімскі водаканал”;

1.4. працоўных калектываў абслугоўваючага сектара эканомікі – працоўны калектыў Слонімскага гандлёвага адкрытага акцыянернага таварыства “Світанак”.

2. Узнагародзіць пераможцаў, пералічаных у пункце 1 дадзенага рашэння, грашовай прэміяй у памеры 50 базавых велічынь кожнаму і пераходнымі сцягамі Слонімскага раённага выканаўчага камітэта і прэзідыума Слонімскага раённага Савета дэпутатаў.

3. Прызнаць пераможцамі сярод устаноў сацыяльнай сферы:

аховы здароўя – Партызанаўскі фельчарска-акушэрскі пункт установы аховы здароўя “Слонімская цэнтральная раённая бальніца”;

адукацыі – дзяржаўную ўстанову адукацыі “Сярэдняя школа № 3 г.Слоніма”;

культуры – дзяржаўную ўстанову адукацыі “Жыровіцкая дзіцячая школа мастацтваў”.

4. Узнагародзіць пераможцаў, пералічаных у пункце 3 дадзенага рашэння, грашовай прэміяй у памеры 20 базавых велічынь кожнаму і пераходнымі вымпеламі Слонімскага раённага выканаўчага камітэта і прэзідыума Слонімскага раённага Савета дэпутатаў.

5. Прызнаць пераможцам сярод сельсаветаў – Азярніцкі сельсавет.

Узнагародзіць Азярніцкі сельскі выканаўчы камітэт грашовай прэміяй у памеры 20 базавых велічынь і пераходным вымпелам Слонімскага раённага выканаўчага камітэта і прэзідыума Слонімскага раённага Савета дэпутатаў.

6. Вызначыць пераможцамі сярод працоўных калектываў вытворчых падраздзяленняў:

6.1. сярод вытворчых участкаў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў – працоўны калектыў вытворчай брыгады ў раслінаводстве № 1 (Жукоўскі П.Я.) камунальнага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства “Імя Суворава”;

6.2. сярод малочна-таварных фермаў – працоўны калектыў малочна-таварнай фермы “Паўлава” (Сварабовіч В.М.) сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «АграПаўлава»;

6.3. сярод фермаў, комплексаў па вытворчасці ялавічыны – працоўны калектыў комплекса “Усход” (Пашынская А.С.) адкрытага акцыянернага таварыства “Сянькоўшчына”;

6.4. сярод будаўнічых брыгад – працоўны калектыў будаўнічай брыгады філіяла “Дарожна-будаўнічае ўпраўленне № 65” адкрытага акцыянернага таварыства “Дарожна-будаўнічы трэст № 6”;

6.5. сярод прадпрыемстваў гандлю і грамадскага харчавання – працоўны калектыў магазіна “Родны кут” аграгарадка Дзераўная (Занімонская В.І.) Слонімскага філіяла Гродзенскага абласнога спажывецкага таварыства;

6.6. сярод вытворчых падраздзяленняў Слонімскага гарадскога ўнітарнага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі і адкрытага акцыянернага таварыства «Слонімскі водаканал» – працоўны калектыў прадпрыемства ацяпляльных кацельняў і цеплавых сетак Слонімскага гарадскога ўнітарнага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

7. Вызначыць пераможцамі сярод прадпрыемстваў малога бізнесу – таварыства з абмежаванай адказнасцю “ДЭКСЭН”.

8. Узнагародзіць удзельнікаў спаборніцтва, пералічаных ў пунках 6 і 7 дадзенага рашэння, грашовай прэміяй у памеры 20 базавых велічынь кожнаму і пераходнымі вымпеламі Слонімскага раённага выканаўчага камітэта і прэзідыума Слонімскага раённага Савета дэпутатаў.

9. Вызначыць пераможцамі сярод працаўнікоў раёна за званне “Лепшы па прафесіі”:

9.1. сярод кіраўнікоў суб’ектаў гаспадарання:

Сіняк Алену Міхайлаўну, дырэктара Слонімскага гандлёвага адкрытага акцыянернага таварыства “Світанак”;

Пяцько Ганну Іосіфаўну, старшыню Азярніцкага сельскага выканаўчага камітэта;

9.2. сярод спецыялістаў сельскай гаспадаркі – Хасанаву Іну Мікалаеўну, брыгадзіра вытворчай брыгады ў жывёлагадоўлі камунальнага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства “Драпава”;

9.3. сярод механізатараў сельскай гаспадаркі – Калодку Уладзіміра Уладзіміравіча, трактарыста-машыніста камунальнага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства “Дружба-Агра”;

9.4. сярод аператараў машыннага даення кароў – Галабурду Алену Мікалаеўну, аператара машыннага даення сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «АграПаўлава»;

9.5. сярод аператараў па дарошчванні буйной рагатай жывёлы – Шацінскую Вольгу Міхайлаўну, жывёлавода адкрытага акцыянернага таварыства “Сянькоўшчына”;

9.6. сярод аператараў па адкорму буйной рагатай жывёлы – Шапавалава Анатолія Сяргеевіча, жывёлавода адкрытага акцыянернага таварыства “Сянькоўшчына”;

9.7. сярод аператараў па догляду свіней – Ляшэвіча Юрыя Мікалаевіча, заатэхніка філіяла замежнага таварыства з абмежаванай адказнасцю “Белдан”;

9.8. сярод работнікаў птушкагадоўчай гаспадаркі – Скок Валянціну Аляксееўну, аператара птушкафабрык і механізаваных ферм аддзялення “Слонім” філіяла “Скідзельская птушкафабрыка” адкрытага акцыянернага таварыства “Агракамбінат “Скідзельскі”;

9.9. сярод работнікаў прадпрыемстваў сувязі – Ламана Мікалая Арсеньевіча, інжынера лінейных збудаванняў сувязі і абаненцкіх прылад Слонімскага занальнага вузла электрасувязі Гродзенскага філіяла рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства “Белтэлеком”;

9.10. сярод работнікаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі:

Бялоцкую Таццяну Анатольеўну, майстра дарожна-эксплуатацыйнага прадпрыемства Слонімскага гарадскога ўнітарнага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі;

Жабруна Уладзіміра Міхайлавіча, слесара-рамонтніка адкрытага акцыянернага таварыства “Слонімскі водаканал”;

9.11. сярод работнікаў прадпрыемстваў электра-, энерга-, газазабеспячэння – Вісаітава Сяргея Сельмурзаевіча, слесара па абслугоўванню і рамонту газавыкарыстоўваючага абсталявання філіяла “Слонімскае вытворчае ўпраўленне” вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства “Гроднааблгаз”;

9.12. сярод работнікаў прадпрыемстваў, якія абслугоўваюць сельскую гаспадарку – Янушку Алега Ігаравіча, ветэрынарнага ўрача-артапеда дзяржаўнай установы “Слонімская раённая ветэрынарная станцыя”;

9.13. сярод вадзіцеляў аўтатранспартных прадпрыемстваў – Беладзеда Віктара Іванавіча, вадзіцеля аўтамабіля філіяла “Аўтобусны парк № 3 г. Слонім” адкрытага акцыянернага таварыства “Гроднааблаўтатранс”;

9.14. сярод будаўнікоў – Бяляўскага Дзмітрыя Мікалаевіча, машыніста катка самаходнага філіяла “Дарожна-будаўнічае ўпраўленне № 65” адкрытага акцыянернага таварыства “Дарожна-будаўнічы трэст № 6”;

9.15. сярод работнікаў прадпрыемстваў гандлю – Лойку Алену Аляксандраўну, начальніка гандлёвага аддзела Слонімскага філіяла Гродзенскага абласнога спажывецкага таварыства;

9.16. сярод работнікаў прамысловых прадпрыемстваў:

Ціханаву Раісу Паўлаўну, машыніста рэзальных машын Гродзенскага абласнога ўнітарнага паліграфічнага прадпрыемства “Слонімская друкарня”;

Каліноўскую Наталію Уладзіміраўну, намесніка генеральнага дырэктара па камерцыйных пытаннях адкрытага акцыянернага таварыства “Слонімскі мясакамбінат”;

Гаўрыльчыка Івана Уладзіміравіча, паяльшчыка цэха вытворчасці кардона адкрытага акцыянернага таварыства “Слонімскі кардонна-папяровы завод “Альбярцін”;

Хвяскевіча Андрэя Антонавіча, столяра зборачнага цэха адкрытага акцыянернага таварыства “Слоніммэбля”;

9.17. сярод служачых праваахоўных органаў – Палхоўскага Аляксандра Лявонцьевіча, намесніка начальніка па ідэалагічнай рабоце і кадраваму забеспячэнню аддзела ўнутраных спраў Слонімскага раённага выканаўчага камітэта;

9.18. сярод служачых раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях і Узброеных Сіл – Рашчынскага Мікалая Анатольевіча, намесніка камандзіра па ідэалагічнай рабоце – начальніка аддзялення ідэалагічнай работы 11-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады;

9.19. сярод работнікаў сферы адукацыі – Логвінаву Ірыну Фёдараўну, метадыста дзяржаўнай установы адукацыі “Слонімскі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі”;

9.20. сярод работнікаў медыцынскіх устаноў – Антончык Святлану Іосіфаўну, урача агульнай практыкі (загадчыка) Сянькоўшчынскай амбулаторыі ўстановы аховы здароўя “Слонімская цэнтральная раённая бальніца”;

9.21. сярод работнікаў сферы культуры – Наваленку Аляксандра Вітальевіча, кіраўніка народнага вакальнага ансамбля “Рябинушка” дзяржаўнай установы культуры “Слонімскі цэнтр культуры і адпачынку”;

9.22. сярод работнікаў сістэмы сацыяльнай абароны насельніцтва – Санюту Алену Міхайлаўну, сацыяльнага работніка аддзялення сацыяльнай дапамогі на даму дзяржаўнай установы “Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Слонімскага раёна”;

9.23. сярод спартсменаў, спартыўных трэнераў – Дзямідзіка Сяргея Іосіфавіча, дырэктара дзяржаўнай установы “Спецыялізаваная дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву № 3 г. Слоніма”.

10. Узнагародзіць пераможцаў, пералічаных у пункце 9 дадзенага рашэння, дыпломамі і грашовай прэміяй у памеры 10 базавых велічынь кожнаму.

Прапанаваць кіраўнікам арганізацый ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку ажыццявіць выплату грашовай прэміі ў памеры 10 базавых велічынь:

Палхоўскаму Аляксандру Лявонцьевічу, намесніку начальніка па ідэалагічнай рабоце і кадраваму забеспячэнню аддзела ўнутраных спраў Слонімскага раённага выканаўчага камітэта;

Пяцько Ганне Іосіфаўне, старшыні Азярніцкага сельскага выканаўчага камітэта;

Рашчынскаму Мікалаю Анатольевічу, намесніку камандзіра па ідэалагічнай рабоце – начальніку аддзялення ідэалагічнай работы 11-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады.

11. Пераможцаў спаборніцтва занесці на раённую Дошку гонару.

12. Групе бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці Слонімскага раённага выканаўчага камітэта (Ракевіч В.М.) выплату грашовых прэмій і выдаткі па афармленні раённай Дошкі гонару ажыццявіць за кошт сродкаў, прадугледжаных у раённым бюджэце на іншыя агульнадзяржаўныя пытанні.

Старшыня Слонімскага раённага Савета дэпутатаў
А.М.Таргонскі

Старшыня Слонімскага раённага выканаўчага камітэта
Г.Б.Хоміч

Кіраўнік спраў Слонімскага раённага выканаўчага камітэта
А.Н.Мачаліна